# «Твой ліст дубовы, як чароўны лек»

Ірына ТУЛУПАВА

**Радасцю ад магчымасці шырокага дыялогу была прасякнута сустрэча з пісьменнікамі беларусаў замежжа “У сэрцы з Радзімай”. Мерапрыемства праходзіла ў рамках XV Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі “СМІ ў Беларусі” і сабрала нашых суайчыннікаў, прадстаўнікоў СМІ і літаратараў з-за мяжы.**

Падчас сустрэчы, якая ладкавалася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, намеснік старшыні культурна-асветніцкага таварыства “Уздым”, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі Станіслаў Валодзька прызнаўся: ідэя пра тое, каб у які з дзён усім нам завітаць у Беларусь, выспявала даўно. Добра, што падчас працы выстаўкі адкрылася такая перспектыва.

У Нацыянальнай бібліятэцы ў гэты час была разгорнута экспазіцыя на якой прадстаўлялася больш як 90 дакументаў пра гісторыю беларускага замежжа, выхадцаў з беларускіх зямель. Збор значна папоўніўся: нашы суайчыннікі прэзентавалі свае кнігі. Прадстаўнікі Польшчы, Латвіі, Літвы, Украіны, Расіі, Эстоніі перадалі ў дар каштоўныя фаліянты, якія, акрамя ўсяго, яскрава заяўляюць пра беларускую культуру як частку еўрапейскай. Старшыня Саюза беларусаў Латвіі Галіна Піскунова, перадаючы стос асобнікаў, у прыватнасці, заўважыла: тут і мастацкая літаратура, і навукова-папулярная, якая стала вы-

нікам шматгадовых даследаванняў. Сярод выданняў — кніга "Латвія-Беларусь: дыялог дзвюх культур"; унікальны праект, ажыццёўлены летась і падтрыманы Рыжскай думай, "Латышска-беларускі і беларуска-латышскі слоўнік"; томік "Славянская гісторыя Латвіі", які ахоплівае перыяд да XVII стагоддзя і распавядае пра гістарычныя судакрананні нашых народаў. На думку прысутных, перадача кніг можа стаць пачаткам стварэння фонду пісьменнікаў беларускага замежжа ў Замку Святла, як паэтычна называюць галоўную бібліятэку нашай краіны беларусы Латвіі.

У гэты ж дзень, 5 мая, адбылася сустрэча з кіраўнікамі беларускіх грамадскіх аб'яднанняў, а таксама прадстаўнікамі беларускамоўных СМІ, дыяспарай з Польшчы, Латвіі, Эстоніі, Украіны і Грузіі ў Міністэрстве культуры Беларусі. Як паведамляе прэс-служба міністэрства, абмеркаваны актуальныя пытанні развіцця супрацоўніцтва з беларусамі замежжа ў сферы культуры.

Цяпер у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ідзе падрыхтоўка Першага фестывалю мастацтваў беларусаў свету, правядзенне якога запланавана на 8—9 ліпеня гэтага года. Сярод яго мерапрыемстваў — гала-канцэрт мастацтваў беларусаў свету ў рамках XX Міжнароднага фестывалю "Славянскі базар у Віцебску"; выставы мастакоў, фатографаў, сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі беларусаў замежжа ў сталіцы Беларусі; правядзенне другога пасяджэння Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь.

Дэлегацыі беларусаў замежжа былі праінфармаваны аб працы па распрацоўцы праекта дзяржаўнай праграмы "Беларусы ў свеце" на 2011—2015 гады, сучасным стане і развіцці культуры ў краіне, планах па адкрыцці культурных цэнтраў Беларусі за мяжой на працягу 2011—2015 гадоў.